Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

№ 6 (437)

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Панядзелак, 6 сакавіка 1961 г.

Цана 1 кап.

8 САКАВІКА— МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

Са святам, ДАРАГІЯ СЯБРОЎКІ!

ТАРАС ШАЎЧЭНКА І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ

*

Паэзія ў любыя часы, у любога народа была заўсёды сардэчным голасам праўды, чалавечага сумлення, чалавечнасці. І гэта, бадай, адзінае, што яднае паэзію ўсіх эпох, усіх народаў. Яднае яно Шэкспіра і Гётэ, Пушкіна і Гейне, Петэфі і Маякоўскага, Уолта Уітмена і Назыма Хікмета. З'яднала яно таксама Тараса Рыгоравіча Шаўчэнку з беларускай паэзіяй, з Я. Купалам і Я. Коласам, М. Багдановічам і П. Трусам, М. Танкам і П. Панчанкам.

Але беларускую паэзію з музай вялікага Кабзара з'яднала не толькі праўдзівасць і чалавечнасць. Іх сувязь куды больш глыбейшая і шырэйшая. Яна — ад кроўнай блізасці беларусаў і ўкраінцаў, ад падобнасці іх гістарычнага лёсу, ад спрадвечнай братняй дружбы і ўспагаднасці, што яднаюць вялікі рускі народ, украінцаў, беларусаў, польскі, чэшскі і іншыя славянскія народы.

Для ўсходне-славянскіх народаў XIX стагоддзе было стагоддзем узмужнення, гартавання народных сіл, мар аб лепшым будучым, барацьбы за яго. Нацыянальна-вызваленчы рух народаў Расіі супраць царызма і прыгнёту быў гарнілам, у якім гартаваліся лепшыя пачуцці дружбы, узаемапавагі, узаемападтрымкі. Лепшыя сілы народаў аддалі гэтаму руху свае таленты. Сярод іх быў Т. Р. Шаўчэнка. Ён стаў усеабдымным увасабленнем нацыянальна-вызваленчай барацьбы, духоўным бацькам свайго народа, яго путяводнай зоркай. Шаўчэнка, выражаючы сваёй паэзіяй антыфеадальны пратэст шырокіх народных мас, перадавыя ідэі нацыянальна-вызваленчага руху свайго часу, сваім паэтычным дарам будзіў народныя масы, нёс ім усведамленне іх сілы, іх бясформенны гнеў фармаваў у рэвалюцыйную страсць, арганізоўваў на рэвалюцыйнае дзеянне. У гэтай сваёй дзейнасці Шаўчэнка стаў выразнікам і валадаром дум не толькі ўкраінскага народа, але і шырокіх працоўных мас усяе Расіі і асабліва шырокіх працоўных мас рускага і беларускага народаў. Шаўчэнка для беларусаў, пакуль у іх не было Я. Купалы і Я. Коласа, быў тое ж самае, што і для ўкраінцаў. Нездарма і саміх дарэвалюцыйных Я. Купалу і Я. Коласа, калі іх слава толькі пачыналася, усе называлі не інакш, як беларускімі Шаўчэнкамі!

Шаўчэнка быў сапраўды бацькам шырокіх народных мас Беларусі ў іх барацьбе за лепшае будучае. Менавіта гэтым і тлумачыцца багатае пранікненне вершаў вялікага Кабзара ў беларускі фальклор. Вершы Шаўчэнкі, блізкія нашаму народу па думах і настроях, па формах выяўлення, народ адразу ж палюбіў і водгалас іх каціўся з краю ў край па ўсёй чыста Беларусі. У самым раннім дзяцінстве чуў іх Купала, чуў і па ўсё жыццё запоўніў, не ведаючы, што ён запамінаў песні вялікага паэта. У самым раннім дзяцінстве чуў іх і Я. Колас, палюбіў іх, несучы затым жывое слова ўкраінскага паэта па беларускіх вёсках і гарадах, усхваляваных рэвалюцыяй 1905 года. Мабыць, так, як Шаўчэнка, да яго на вусную паэзію беларускага народа ніводзін з паэтаў не ўздзейнічаў. Надзвычай вядомымі сталі ў Беларусі такія песні вялікага ўкраінскага паэта, як «Реве та стогне Дніпр широкий», «Заповіт», «Ой, одна я, одна», «От села до села» і іншыя. Першапрычынай іх папулярнасці былі, зразумела, ідэйная накіраванасць, народнасць песень. Але не апошнюю ролю ў гэтым сыграла вобразна-выяўленчая блізкасць шаўчэнкаўскіх вершаў да беларускай народнай песні. Блізкасць гэта выцякала перш на перш з агульнасці многіх вобразаў і матываў паэзіі Шаўчэнкі і вуснай паэзіі беларусаў, а таксама з блізкасці самой паэтыкі песень украінскіх і беларускіх. Трэба разам з тым думаць, што яна выцякала таксама з глыбокага ведання народным украінскім паэтам уласна беларускай народнай песні. Яшчэ народны паэт Беларусі Я. Колас звярнуў увагу на пераклічку шмат якіх народных беларускіх песень — рэкруцкіх, аб сірочай долі, чумацкіх—з многімі творамі геніяльнага ўкраінскага паэта. Думаецца, што такая пераклічка ішла ад канкрэтнага ведання і зацікаўленасці вялікага ўкраінскага паэта да беларускай народнай песні.

Цэлы шэраг фактаў якраз недвухсэнсоўна ўсё гэта пацвярджае. Яшчэ пятнаццацігадовым падлеткам у 1829 годзе Т. Р. Шаўчэнка — дваровы памешчыка Энгельгардта—пешкі ад Лоева да Вільні прайшоў цераз усю Беларусь. Рэчыца, Жлобін, Бабруйск, Ігумень, Мінск, Радашковічы, Краснае, Маладзечна, Пруды, Смаргонь — вось куды ішоў будучы паэт, ішоў з адкрытым сэрцам і вачыма, чутны да таго, што навокал дзелася. Ці ж не тады маглі запасці ў душу паэта песні, якія цераз гады далі сябе знаць асобнымі радкамі непаўторнай яго паэзіі і якія, зноў жа цераз гады, так лёгка змог вылучыць народны паэт самой Беларусі?

Цераз Беларусь праязджаў паэт і пазней — ужо вядомым аўтарам «Кабзара», у 1843 і 1847 годзе. Беларусь заўсёды вабіла да сябе Шаўчэнку. Яго цяга зноў пабываць на Беларусі асабліва сказалася ў пісьмах да вядомага польскага мастака Браніслава Залескага, сябра паэта па высылцы. Пісьмы гэтыя датуюцца 1857—59 гадамі. Як у іх, так і ў дзённікавых запісах за гэтыя гады, паэт не аднойчы выяўляе свае намеры-жаданне прыехаць у Беларусь, на Случчыну, у вёску Рачкавічы, дзе тады жыў і працаваў Б. Залескі. Толькі неспрыяльныя абставіны, і перш за ўсё жандарская слежка не дазволілі паэту здзейсніць яго мары. Тым не менш, з Б. Залескім пасля вяртання з высылкі Т. Р. Шаўчэнка сустрэўся. Гэта здарылася ў Пецярбургу.

А што вялікі ўкраінскі паэт праяўляў зацікаўленасць да беларускай народнай песні, гэта ўжо высвятлілася значна пазней, да 1859 года, калі Б. Залескі і Т. Р. Шаўчэнка пасля васьмігадовай разлукі зноў сустрэліся. Ёсць пэўныя звесткі, што Шаўчэнка ў пецярбургскі перыяд жыцця пазнаёміўся з некаторымі беларускімі літаратурнымі і фальклорнымі творамі. Адзін з дарэвалюцыйных даследчыкаў і збіральнікаў рукапісных матэрыялаў па беларускай літаратуры Рамуальд Зямкевіч у змешчаным у «Нашай ніве» (1911) артыкуле «Т. Шаўчэнка і беларусы» паказвае змест ліста польскага паэта Вінцука Рэута да польскага бібліёграфа і педагога Ігнація Лечатовіча, у якім прыводзіць водгукі Шаўчэнкі на некаторыя творы беларускай літаратуры. У гэтым лісце паведамляецца, што ў 1839 годзе ў Пецярбургу Шаўчэнка сустракаўся з літаратарам Рамуальдам Друцкі-Падбярэзкім, з беларускім паэтам Я. Баршчэўскім і іншымі. Р. Зямкевіч піша: «Шаўчэнка пазнаёміўся з усімі гэтымі беларусамі, прасіў іх, каб чыталі яму свае творы, і асабліва зацікавіўся народнымі беларускімі песнямі».

Такім чынам, сувязь Т. Р. Шаўчэнкі з беларускай паэзіяй пачалася перш за ўсё з жывой еднасці паэта з песенна-народнымі традыцыямі беларусаў, з яго пастаяннай цікавасці да фальклора братняга беларускага народа.

Са з'яўленнем на Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа значэнне паэзіі Шэўчэнкі для беларускай паэзіі, для беларускага народа не прыўменшылася і незацерлася, а толькі набыло новыя формы, праяўляючыся ў новых сувязях і апасродкаванасці.. Як і раней, паэзія Т. Р. Шаўчэнка прасвятляла і заклікала «рабіў німіх», («нямых рабоў»), рэвалюцыянізуючы іх. Яна заставалася ў страі, робячы тую ж пачэсную працу, што і дарэвалюцыйныя вершы Я. Купалы і Я. Коласа. Як некалі раней, так і цяпер беларускі працаўнік не пакідаў песні Шаўчэнкі.

(Заканчэнне на 2 стар.)

МАЯ ШКОЛЬНАЯ СЯБРОЎКА

Свету Ткач я ведаю з маленства. Невысокага росту, сталая, разважлівая і адначасова па-дзіцячаму гарэзлівая — яна заўсёды была добрым, чулым таварышам, нястомным актывістам.

У Крупскай сярэдняй школе Мінскай вобласці, дзе Света пераадолела першыя ступенькі лесвіцы ведаў, яе ведалі, як прыкладную вучаніцу, лепшую атрадную важатую, добрую спартсменку. Асабліва захаплялася яна веласпортам. Чатыры гады назад на абласных спаборніцтвах Света абараняла гонар Крупскага раёна па веласіпеднаму спорту і заняла другое месца. Ёй быў уручаны дыплом другой ступені.

Падоўгу любіла Света важдацца і ў кабінеце машынаznайства, у хімічнай лабараторыі школы. А яшчэ ў большай ступені захаплялася кнігамі. Іх Света чытала без разбору. Памятаю, з якім запалам спрачалася яна з сяброўкамі аб прачытаным.

Помніцца і яшчэ адзін эпізод з жыцця Святланы Ткач. Было гэта ў 1958 годзе. Урачыста, хвалюючa празвінеў апошні званок, і ў руках дзяўчыны — атэстат сталасці. Света збіралася стаць студэнткай універсітэта. Падала дакументы на хімічны факультэт. Але, прыехаўшы на ўступныя экзамены, адразу ж забрала іх.

— Лепш папрацую спачатку. Баюся памыліцца ў выбары прафесіі, — шчыра і проста растлумачыла яна маці.

Свету накіравалі ў Дзяніса-віцкую сярэднюю школу ў якасці старшай піянерважатай. Праводзячы зборы, дапамагаючы маці Ганне Фёдараўне — настаўніцы пачатковых класаў — правяраць вучнёўскія сшыткі, Святлана ўсё больш і больш разумела: яна знайшла тое, што ў жыцці называюць прызваннем.

У 1959 годзе Святлана Ткач здавала ўступныя экзамены ва ўніверсітэт з цвёрдым намерам: стаць настаўніцай хіміі і нікім іншым.

Зараз Святлана — студэнтка другога курса. Я рэдка сустракаю яе: займаецца яна ў першую змену, шмат часу праводзіць у лабараторыях, кабінетах, бібліятэках.

Вось сёння час хутка праб'е адзінаццаць вечара, а 257-ы пакой у інтэрнаце па вуліцы Дзімітрава ўсе яшчэ закрыты.

— У Светы сёння камсамольскі сход, — растлумачвае мне яе суседка. — Яна ж камсорг на другім курсе.

А толькі што падышоўшая аднакурсніца Светы Таіса Майсёнак дадала:

— Сход ужо скончыўся, і Света пайшла на заняткі ў секцыю спартыўнай гімнастыкі..

Так і не сустрэла я ў той вечар сваю школьную сяброўку.

У дзень нашага свята — 8-га сакавіка — мне хочацца ад усяго сэрца павіншаваць Святлану Ткач і перадаць гэтаму неспакойнаму чалавеку мае самыя найлепшыя пажаданні ў вучобе, грамадскай дзейнасці, асабістым жыцці. Няхай яе рэкі ініцыятывы і камсамольскага запалу ніколі не мялеюць! Няхай яна стане лепшай спартсменкай і ва універсітэце!

І я ўпэўнена, што гэта будзе так!

Таццяна ХАРАВЕЦ..

На універсітэцкім двары

Размова аб прафесіі

Два разы ў месяц на юрыдычным факультэце адбываюцца сустрэчы з юрыстамі, якія выступаюць перад студэнтамі з гутаркамі на тэму: «Ваша будучая прафесія». У гасцях у студэнтаў ужо пабывалі следавацелі пракуратур, пракуроры, народныя суддзі, дзяржаўныя арбітры, юрысконсульты, натарыусы. Яны падзяліліся сваімі ўражаннямі аб юрыдычным факультэце, расказалі аб найбольш цікавых фактах з іх практычнай работы.

Днямі на факультэце абылася чарговая сустрэча з членам Мінскага абласнога суда тав. Сербінай. Яна расказала аб некаторых выпадках дзейнасці суда, маючых немалаважнае тэарытычнае і практычнае значэнне, аб гаранавай працы савецкага суддзі. У заключэнне сустрэчы тав. Сербіна адказала на шматлікія пытанні студэнтаў.

Сустрэчы з цыкла «Ваша будучая прафесія» дапамагаць студэнтам лепш пазнаць сваю будучую прафесію, прывіваюць любоў да яе.

Л. СЯНЮТА.

Дзеці не сумавалі

Дзень у мінулую нядзелю выдаўся сонечны. Студэнткі IV курса філфака Ніна Ткач і Уладзіслава Ус з раніцы накіраваліся ў 54 рускую школу Мінска. Там іх чакалі піянеры. Хутка ўсе разам адправіліся за горад, у маляўнічае мястэчка Зялёнае. Былі тут і вучні 42 сярэдняй школы. З імі выехалі практыканты Галіна Лябёдка, Валянціна Гардзейка, Аксана Колб, Аляксандр Міклуш, а таксама выкладчык кафедры фізічнага выхавання М. А. Шэйнеман.

Адразу па прыбыцці на месца практыканты арганізавалі цікавыя гульні, а затым спаборніцтвы па турызму. Дзеці правялі паход, прымаючы ўдзел у захапляючай гульні «Сакрэтны пакет», ставілі і разбіралі палаткі, вучыліся арыентавацца на мясцовасці.

Хутка ішоў час. Стомленыя, але вясёлыя, вярталіся ўсе назад. Падарожжа прынесла карысць не толькі дзецям, але і практыкантам. Яны бліжэй пазнаёміліся яшчэ з адным важным бокам педагагічнай работы — фізічным выхаваннем дзяцей.

Р. ВАСІЛЬЕЎ.

Пісьменнік у гасцях у студэнтаў

Вялікая 44-я аўдыторыя корпуса гуманітарных навук у гэты вечар не магла ўмясціць усіх жадаючых папасці на сустрэчу з вядомым беларускім пісьменнікам І. П. Шамякіным. Студэнты філалагічнага факультэта запрасілі яго на абмеркаванне кнігі «Трывожнае шчасце».

— Мы добра знаёмы з аўтарам глыбокай плыні», «Крыніц», «У ·ры час», — сказаў ва ўступным слове пісьменнік І. Я. Навуменка. — Сёння мы сабраліся, каб у простай, шчырай размове пагаварыць аб яго апошняй кнізе.

Уражаннямі аб кнізе дзяляцца студэнты Карызна, Рагойша, Давыдоўскі, Сыраквашка, Бяржынскі, Няхай, Пілярскся.

У заключэнне выступіў Іван Шамякін. Ён расказаў аб рабоце над «Трывожным шчасцем» і нагогул аб творчай лабараторыі пісьменніка. Прысутныя даведаліся, што ён зараз працуе над новым раманам з жыцця гарадской інтэлігенцыі.

Студэнты горача дзякавалі І. П. Шамякіну за добрую сустрэчу і пажадалі новых творчых удач. У канцы многія студэнты атрымалі кнігі з аўтографам пісьменніка.

Ул. ВЕРАМЕЙЧЫК.

ТАРАС ШАЎЧЭНКА І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

(Пачатак на 1 стар.)

Але іменна цяпер, на пачатку дваццатага стагоддзя, больш, чым калі-небудзь да гэтага ці пасля гэтага часу, песня Шаўчэнкі ўплывала на песні беларускіх паэтаў. Я. Купала, Я. Колас, Э. Цётка, А. Гурло, Я. Журба і іншыя, разбуджаныя да літаратурнай працы рэвалюцыяй 1905 года, творча вучыліся ў Шаўчэнкі. Ён быў для іх узорам паэта, узорам служэння свайму народу. Яны развівалі матывы Шаўчэнкаўскай творчасці, імкнуліся творча перайняць вобразнасць, рытміка-інтанацыйны склад вершаў украінскага паэта і інш. Найбольшую залежнасць ад Шаўчэнкі праявілі, найшчадрэй у яго вучыліся маладыя Я. Купала і Я. Колас. У Т. Шаўчэнкі вучыліся яны знаходзіць гнеўныя і бязлітасныя словы, накіраваныя супраць ворагаў народа.

Не без уплыву Шаўчэнкі былі напісаны вядомыя паэмы Я. Купалы «Бандароўна», «Яна і я», «Магіла льва». Аб уплывах Шаўчэнкі на сваю творчасць, у прыватнасці, на паэму «Новая зямля», у артыкуле «Шаўчэнка і беларуская паэзія» гаварыў Я. Колас.

Плённым заставаўся ўплыў Шаўчэнкі і на маладую беларускую савецкую паэзію 20-х гадоў. Гэты ўплыў перш за ўсё выражаўся ў творчым выкарыстанні вобразна-выяўленчых традыцый паэта, у захапленні народна-паэтычным складам яго вершаў. Найбольш выразнай і найбольш удалай вучобаю ў Шаўчэнкі вылучалася ў 20-я гады паэзія П. Труса. Аб гэтай вучобе вельмі трапна ў свой час напісаў Я. Колас: «Прастаце, народнасці, музыцы верша і ўсяму таму зачараванню, што так падкупляе ў паэзіі Шаўчэнкі, ён вучыўся ў вялікага ўкраінскага Кабзара. Канву шмат якіх шаўчэнкаўскіх паэм кладзе ён у аснову сваіх твораў. Ён шырока і па-майстэрску выкарыстоўвае прыём Т. Шаўчэнкі — уплятаць у ткань твора народныя песні, умела падбіраючы іх і захоўваючы поўную гармонію паміж імі і творам. Тон і рытмічны рысунак паэзіі Шаўчэнкі з усёю яе сваеасаблівасцю, выкарыстанне характэрнага для Шаўчэнкі сямістопнага харэя з цэзурай пасля чацвёртай стапы, паэтычныя прыёмы паралелізму— усё гэта шырока запазычана маладым беларускім паэтам у Шаўчэнкі».

Паўлюк Трус быў да глыбіні душы ўлюблёны ў паэзію Кабзара. Гэтым і тлумачыцца захапленне Труса не толькі вобразна-выяўленчымі прыёмамі Шаўчэнкі, але і простай кантамінацыяй у свае песні асобных радкоў вялікага паэта. Трус часамі браў у свой верш, як цэлае, асобныя радкі, так і строфы Шаўчэнкі, некалькі іх вар'іруючы. Напрыклад, у Шаўчэнкі:

Сонце гріе, вітер віе
З поля на долину...

У Труса:

Веюць ветры, ветравінне
З поля на даліну...

Не на аднаго Труса, на ўсю беларускую савецкую паэзію ўплывала непаўторнае харство паэтычнага слова Шаўчэнкі. Яно чутна ў паэзіі М. Танка і А. Куляшова, П. Панчанкі і М. Лужаніна, А. Вялюгіна, А. Бялевіча, Ул. Караткевіча, Р. Барадуліна і інш. Гэты водгалас — малая доля таго нясплаванага доўгу, у якім яшчэ знаходзіцца наша паэзія перад геніем вялікага ўкраінскага народа, які некалі падтрымаў нашу паэзію ў яе першых нясмелых кроках, які акрыляў яе ў дарэвалюцыйны час, будучы для яе ўзорам патрыятызма і народнасці, які шчодра ўзбагаціў яе ад свае паэтычнай красы ў савецкі час, у час небывалага росквіту беларускай паэзіі.

Аб любві беларускага народа і беларускіх паэтаў да Т. Р. Шаўчэнкі сведчыць іх вялікая пашана да неўміручага «Кабзара». Гэтая кніга вершаў ужо двойчы поўнасцю перакладалася ў нас — у 1939 годзе і ў 1952. Яе ў нас любяць, ёю зачытваюцца.

Паэзія Т. Р. Шаўчэнкі — неаддымная часціна культуры нашай сучаснасці, нашай культуры. З яе традыцыямі, з іх лепшым творчым развіццём звязаны сённяшні і заўтрашні дзень і нашай беларускай савецкай паэзіі. Новая, бо абноўленая Вялікім Кастрычнікам, узмужнелая ідэйна, арыгінальная і непаўторная, сённяшняя беларуская паэзія ў сваёй істоце непадобная да паэзіі вялікага Кабзара. Ды яна жыве яе традыцыямі, убірае ў сябе ўсё яе незабыўнае і хвалюючае. Паэзія паэзію разумее. Паэзія Шаўчэнкі застаецца векавечнай сілай, векавечным харством. І яно натхняла, натхняе і будзе натхняць нашу паэзію.

А. А. ЛОЙКА,
кандыдат філалагічных навук.

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ПЕСНЯРА

28 лютага на філалагічным факультэце адбыліся літаратурныя чытанні, прысвечаныя стагоддзю са дня смерці выдатнага ўкраінскага паэта Т. Р. Шаўчэнкі.

Кароткім уступным словам чытанні адкрыў дэкан факультэта прафесар М. Р. Ларчанка. З дакладам «Т. Р. Шаўчэнка і беларуская літаратура» выступіў А. А. Лойка.

Пытанню гістарычнай тэмы ў творчасці Т. Р. Шаўчэнкі быў прысвечан даклад С. А. Лысенка.

Аб уплыве вуснай народнай творчасці на творчасць Шаўчэнкі гаварыла В. А. Захарава.

Творчасцю Шаўчэнкі цікавіліся і замежныя славянскія пісьменнікі. Яны бачылі ў ім змагара за славянскае адзінства. Таму Шаўчэнку перакладалі на балгарскую, польскую, чэшскую мовы. Гэтай праблеме быў прысвечан даклад В. М. Цімафеевай.

А на наступны дзень у цэхах і Мінскага аўтазавода вучоныя і студэнты правялі гутаркі аб жыцці і дзейнасці Т. Р. Шаўчэнкі.

Л. АКАЛОВІЧ.

На конкурс

В. АНЦЫФЕРАЎ. **Фотаэцюд. СЁСТРЫ-БЯРОЗЫ**

СПОРТ

На старце—філолагі

— На старт! Увага! Марш! — і новая пара бягуноў, зрываючыся з месца, імкнецца да фінішнай лентачкі...

Ідуць спаборніцтвы па легкай атлетыцы ў філолагаў на асабіста-камандзнае першынство факультэта ў зімовых умовах. Два дні на спартыўных пляцоўках парка імя Горкага спаборнічалі бягуны і штурхальнікі ядра.

Спаборніцтвы пачаліся забегамі мужчын на сто метраў. На гэтай дыстанцыі тры першыя месцы занялі першакурснікі. Лепшы час паказаў А. Масарэнка — 13,4 сек. Улічваючы дрэнны стан дарожкі, гэты вынік можна лічыць добрым.

У жанчын на гэтай дыстанцыі перамагла студэнтка другога курса Тамара Меер з вынікам 14 секунд роўна. У забегах на 500 метраў яна таксама была першай.

Па-за канкурэнцыяй у бегу на 1.000 і 3.000 метраў быў адзін з лепшых стайераў універсітэта студэнт другога курса Мікалай Гаўрычэнка. Яго час адпаведна — 3 мінуты роўна і 10 мін. 12 сек.

У гэты ж час у спартыўнай зале корпуса гуманітарных навук спаборнічалі прыгуны. Планка на вышыні 140 сантыметраў. Яе пераадольваюць студэнт трэцяга курса Філістовіч і першакурснікі Гамолін і Васіленя. Суддзі падымаюць планкі яшчэ на пяць сантыметраў. Гэту вышыню змог узяць толькі Гамолін. Ён таксама перамог у трайным прыжку з месца—7 м 79 см.

Студэнтка другога курса Жана Маркава ўзяла вышыню 120 сантыметраў.

Парадавалі добрымі вынікамі штурхальнікі ядра. У жанчын далей за ўсіх штурхнула ядро член зборнай каманды рэспублікі па лёгкай атлетыцы студэнтка чацвёртага курса Марыя Верамейчык.

Валянцін Жвалеўскі выйшаў пераможцам па штурханню ядра сярод мужчын.

Праграма спаборніцтва вычарпана. У камандным заліку першае месца заваяваў дружны калектыў першакурснікаў. Ім уручан дыплом першай ступені.

Г. БУГРЫМ,
студэнт першага курса аддзялення рускай мовы і літаратуры.

На другім месцы

Пяць ВНУ Мінска ўдзельнічала ў стралковых спаборніцтвах, прысвечаных 43-й гадавіне Савецкай Арміі.

Першае месца заняла каманда медыцынскага інстытута. Стралкі нашага ўніверсітэта занялі другое месца. З членаў нашай каманды лепшы вынік паказаў студэнт пятага курса фізічнага факультэта В. Пахута. Ён выбіў 257 ачкоў з 300 магчымых.

Б. БАРЫСАЎ.

Турнір працягваецца

Другі тыдзень ідуць спаборніцтвы па шахматах і шашках сярод выкладчыкаў, навуковых работнікаў і супрацоўнікаў універсітэта. За права называцца пераможцай змагаюцца шэсць каманд ад розных факультэтаў.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:

Мінск,
Універсітэцкі гарадок
біякорпус, 31;
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецт
БДУ імя Ул. І. Лені

АТ 06321. Зак

Вечаслаў КАПЦІЛОВІЧ

З ДЗЁННІКА ТУРЫСТА

Сярод шумлівых лясоў і азёр

(Пачатак у № 5)

Начавалі мы ў рабочых інтэрнатах. Мне і двум Валерыям— Снапко і Пракошыну, пашанцавала: папалі ў пакой да рабят з брыгады камуністычнай працы.

Утульны пакой. На этажэрцы і тумбачках кніг больш, чым у некаторых студэнцкіх пакоях (хлопцы займаюцца завочна ў навучальных установах) на сценах вісяць карціны. Разгаварыліся. Антон Уласевіч, кіраўнік брыгады камуністычнай працы, расказаў аб сваёй брыгадзе, якая выконвае месячныя заданні на 150—164 працэнты. Успомнілі будаўнікі і пра свайго сябра камсамольскага важака Пятра Блахіна, які загінуў ад цяжкай хваробы. Яго імем будзе названа ў горадзе вуліца.

Ужо поўнач, а шчырая непасрэдная гутарка не спыняецца. Шмат цікавых пытанняў узнікае ў нас. Мы жыва здружыліся з гэтымі слаўнымі хлопцамі.

25 *СТУДЗЕНЯ. Член камітэта камсамола «Нафтабуда» Ала Літвін павяла нас на будоўлю нафтаперапрацоўчага завода, якая знаходзіцца ў кіламетрах пяці ад пасёлка. На яго ўскраіне мы звярнулі ўвагу на агромісты будынак, тры паверхі якога ўжо ўзняліся над долам. Гэта будуецца лабараторны корпус для філіяла Беларускага палітэхнічнага інстытута. Недалёка вядзецца будаўніцтва маста праз Дзвіну. Тут пройдзе чыгунка.*

Дарога ідзе праз лес. Туды-сюды снуюць машыны, аўтобусы, але мы верны прынцыпам спартыўнага турызма: ідзем пешшу. Вось лес раступіўся і перад намі разгарнулася велічавая панарама будаўніцтва. Злева карпусы завода будаўнічых матэрыялаў, які ўжо дае сваю прадукцыю будоўлі, а далей аж да самага гарызонта ўзвышаюцца краны, стрэлы экскаватараў, высокія рэзервуары, сцены карпусоў, далёка справа відаць карпусы і трубы электрастанцыі, якая ўзводзіцца.

Заходзім ва ўпраўленне будоўлі. Начальнік Генплана нафтаперапрацоўчага завода Арсенцій Міхайлавіч Анісімаў расказвае нам пра будоўлю завода, пра будучы горад нафтавікоў, знаёміць з праектам і чарцяжамі. Аказваецца, цяперашні пасёлак — гэта толькі адзін мікрараён, а такіх будзе некалькі. Намячаецца разбіць у бліжэйшы час вялікі парк, пабудаваць дзве школы, у гэтым годзе пачаць будаўніцтва тэатра. Горад разлічан на семдзесят тысяч жыхароў. Першую чаргу завода намячаецца здаць у эксплуатацыю ў канцы 1962 года, але будаўнікі ўзялі абавязацельства закончыць будаўніцтва на год раней тэрміну. Затым Арсенцій Міхайлавіч павёў нас на тэрыторыю будоўлі. Мы бачылі людзей, якія, нягледзячы на мароз, узводзяць рэзервуары для прыёму нафты, кладуць сцены, капаюць канавы. Характэрна тое, што будаўнікі маладыя — будоўля камсамольская. Кругом, як акінуць вокам, кіпіць работа: гудкі, гул матораў, удары молатаў, блеск электразваркі, дым з трубаў—вось што цяпер напаўняе прыдзвінскія лясы.

У пасёлак вярталіся аўтобусам. Нас запрасілі на сустрэчу з вучнямі сярэдняй школы, і мы спяшаліся. Сустрэча прайшла захапляюча. Наступіў час развітання з гэтым слаўным маладым горадам, з гэтымі чулымі, гасцінnымі і вясёлымі людзьмі. Тут мы адчулі, што такое працоўны гераізм і радасць стварэння, адсюль мы вывезлі самыя прыемныя ўспаміны...

Снег у лесе быў глыбейшы і мы сталі на лыжы. Яркае сонца не грэла. Значна больш грэлі, нават парылі, рукзакі, якія сваей пятнаццацікілаграмавай вагой давілі на плечы.

У вёсцы Махірава зайшлі ў хату, каб паабедаць. Гаспадары дома аказаліся вельмі гасціннымі. Пасля добрага абеду не хацелася ісці далей, але турызм — справа настойлівая, трэба прыбыць у запланаваны пункт, і мы зноў ідзем лесам.

Паветра чыстае, пахне смольнай сасной, мароз прыемна пашчыпвае шчокі, пад лыжамі скрыпіць снег. Мы хутка рухаемся наперад. Пачынае змяркацца. І вось першыя непрыемнасці. Паламалася лыжа ў Колі Скарабагатага, у Галі Нікіцінай адарвалася мацаванне, а я наскочыў на пянёк, і лыжа разляцелася на дзве часткі, стала сапраўды турысцкай: можна лажыць у рукзак. Ужо цёмна: рамантаваць немагчыма і мы рушылі далей пешшу.

У Кушлякі ўвайшлі позна вечарам. Спачатку мы адшукалі хату дырэктара школы. Андрэй Арцёмавіч Радашкевіч, гаварлівы чалавек, ветліва сустрэў нас, завёў у школу і прадаставіў нам для начоўкі самы ўтульны клас. Ніна Кручкова і Ніна Песенька распалілі печку і пачалі рыхтаваць гарохавы суп і кампот...

Эх, якая прыемная вячэра пасля цяжкага пераходу!

(Працяг будзе)